Спорт-тайм

# СТАЎКА НА МАЛАДЫХ І ТАЛЕНАВІТЫХ

**Хакейнае «Дынама» разлічылася з гульцамі і прыступае рыхтавацца да новага сезона. Пра гэтыя ды іншыя навіны спорту расказваем у штотыднёвым аглядзе «Звязды».**

**1.** ***Хакейны клуб «Дынама–Мінск» цалкам разлічыўся па запазычанасцях перад хакеістамі.*** Сітуацыю з фінансамі ў клубе пракаментаваў **генеральны дырэктар «Дынама–Мінск» Дзмітрый БАСКАЎ**:



«Для нас вельмі важна было ўвайсці ў новы сезон без запазычанасцяў, і цяпер у мяне ёсць упэўненасць, што так і будзе. Клуб пацвердзіў свой статус надзейнага партнёра, які трымае слова і няўхільна выконвае ўсе абяцанні. У нас яшчэ засталіся нязначныя запазычанасці перад падрадчыкамі і пастаўшчыкамі, якія пастунова закрываем, і ў найбліжэйшы час выплацім усё да капейкі. Не ўтаю, што і цяпер у «Дынама» няма залатых гор, але мінімальныя патрабаванні КХЛ мы будзем гатовыя выканаць. Беларусь захавала свайго прадстаўніка ў наймацнейшай лізе Еўропы, значыць, айчынны хакей працягне паступальна развівацца, што асабліва важна напярэдадні дамашняга чэмпіянату свету», — сказаў гендырэктар. Склад каманды будзе канчаткова сфарміраваны, «Дынама» прыступіць да падрыхтоўкі, план якой сумесна з трэнерскім штабам распрацаваны і зацверджаны. «Упэўнены, што ў нас атрымаецца стварыць канкурэнтаздольны калектыў і пры гэтым не адступіць ад абранай раней стратэгіі развіцця клуба, якая прадугледжвае стаўку на маладых, таленавітых беларускіх гульцоў. Мы бачым закладзены ў іх патэнцыял і гатовыя яго раскрыць».

**2.** ***У футбольным чэмпіянаце Беларусі завяршылася праграма 16-га тура.*** Футбалісты «Мінска» на полі сталічнага стадыёна «Трактар» згулялі ўнічыю з аўтсайдарам турніру бабруйскай «Белшыны» — 2:2. «Тарпеда–БелАЗ» саступіў салігорскаму «Шахцёру» — 1:4, а ў Брэсце «Рух» перайграў мінскае «Дынама» — 1:0.

Вынікі астатніх сустрэч 16-га тура: БАТЭ (Барысаў) — «Энергетык–БДУ» (Мінск) — 0:1, «Гарадзея» — «Віцебск» — 2:2, «Славія» (Мазыр) — «Слуцк» — 3:1, «Смалявічы» — «Дынама» (Брэст) — 3:3, «Нёман» (Гродна) — «Іслач» (Мінскі раён) — 1:0.

Турнірнае становішча: БАТЭ (Барысаў) — 30 ачкоў (16 матчаў), «Нёман» — 29 (15), «Энергетык–БДУ» — 29 (16), «Шахцёр» (Салігорск) — 27 (15), «Тарпеда–БелАЗ» — 26 (15), «Дынама» (Брэст) — 26 (16), «Дынама» (Мінск) — 23 (15), «Іслач» (Мінскі раён) — 23 (16), «Віцебск» — 22 (16), «Славія» — 21 (16), «Рух» (Брэст) — 19 (15), «Слуцк» — 18 (16), «Гарадзея» — 16 (16), «Мінск» — 15 (14 ), «Смалявічы» — 11 (15), «Белшына» (Бабруйск) — 7 (16).



Бамбардзірскую гонку ўзначальвае ўзбекскі нападаючы «Энергетыка–БДУ» Джасурбек Яхшыбоеў, які забіў дзевяць мячоў.

Адзначым таксама, што настаўнік гродзенскага «Нёмана» Ігар Кавалевіч прызнаны найлепшым трэнерам футбольнага чэмпіянату Беларусі ў чэрвені. Такі вынік традыцыйнага галасавання журналістаў вядучых беларускіх СМІ, які праводзіца асацыяцыяй «Беларуская федэрацыя футбола». У першы летні месяц падапечныя Ігара Кавалевіча атрымалі чатыры вікторыі ў чатырох праведзеных матчах, забіўшы сем мячоў і прапусціўшы толькі адзін. Пачынаючы з 21 мая футбалісты «Нёмана» выйгралі ўсе сем праведзеных паядынкаў.

**3.** ***Экс-гулец зборнай Беларусі па валейболе Станіслаў Салікаў афіцыйна ўзначаліў «Мінчанку», змяніўшы на пасадзе галоўнага трэнера Віктара Ганчарова.***



Настаўнік ужо прыбыў у Мінск, і неўзабаве каманда пад яго кіраўніцтвам пачне перадсезонную падрыхтоўку. Вядомы беларускі спецыяліст Станіслаў Салікаў пасля завяршэння спартыўнай кар'еры ўваходзіў у трэнерскі штаб жаночай зборнай Беларусі, затым працаваў у трэнерскім штабе краснадарскага «Дынама» пад кіраўніцтвам Канстанціна Ушакова. Быў задзейнічаны ў структуры клуба «Уралачка–НТМК», працаваў асістэнтам знакамітага настаўніка Мікалая Карпаля. Мінулы сезон ён правёў у якасці настаўніка маладзёжнай каманды са Свярдлоўскай вобласці, якая выступала ў Вышэйшай лізе А чэмпіянату Расіі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.48 | 21.41 | 16.53 |
| Віцебск — | 4.29 | 21.39 | 17.10 |
| Магілёў — | 4.38 | 21.31 | 16.53 |
| Гомель — | 4.43 | 21.19 | 16.36 |
| Гродна — | 5.05 | 21.54 | 16.49 |
| Брэст — | 5.14 | 21.46 | 16.32 |

### Месяц

*Поўня 5 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Вадаліва.*

### Імяніны

*Пр.* НАРАДЖЭННЕ ІААНА ПРАДЦЕЧЫ.
*Антона, Івана, Якава.*
*К.* Кіры, Бенядзікта, Кірылы, Мяфодзія.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## ЗАЎТРА





## Даты Падзеі Людзі

### 7 ЛІПЕНЯ

У краіне

**1910** год — нарадзіўся (цяперашні Маладзечанскі раён) Юзаф Трыпуцкі, шведскі мовазнавец-славіст. У 1934 годзе скончыў Віленскі ўніверсітэт. Выехаў у Хельсінкі выкладаць польскую мову. З 1940-га выкладаў ва ўніверсітэце горада Упсала (Швецыя), з 1966-га прафесар. У працах «Мова Уладзіслава Сыракомлі», «Аб мове ўспамінаў Францішка Міцкевіча» адзначаў беларусізмы аўтараў.

**1915** год — нарадзіўся Мікалай Палікарпавіч Чалы, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну з 1941-га на флоце. З чэрвеня 1944-га камандзір берагавой групы задымлення 66-га асобнага атрада дэгазацыі і дымамаскіроўкі, затым дэсантна-разведвальнага атрада Дняпроўскай ваеннай флатыліі. 28 чэрвеня 1944 года маракі атрада пад камандаваннем малодшага лейтэнанта Чалага фарсіравалі Прыпяць каля вёскі Скрыгалава Мазырскага раёна, пераадолеўшы драцяную загароду і міннае поле, выявілі размяшчэнне варожых сіл. 29 чэрвеня 1944-га маракі вызвалілі вёску Конкавічы Петрыкаўскага раёна, 1 ліпеня іх атрад першым уварваўся ў вёску Дарашэвічы таго ж раёна, падбіўшы чатыры танкі праціўніка. Загінуў у гэтым жа баі...



**2005** год — па ініцыятыве спартыўнай грамадскасці краіны быў створаны Прэзідэнцкі спартыўны клуб. Беларускія спартсмены, ветэраны спорту, трэнеры, кіраўнікі і выкладчыкі спартыўных школ аб'ядналіся ў некамерцыйную арганізацыю, каб падтрымаць фізкультурна-аздараўленчы рух у краіне, стварыць неабходныя ўмовы для заняткаў спортам і фізічнай культурай.

У свеце

**1550** год — у Іспанію з Амерыкі была прывезена першая партыя шакаладу. У гэты дзень адзначаецца агульнаеўрапейскі дзень шакаладу.

**1860** год — нарадзіўся Густаў Малер, аўстрыйскі кампазітар, дырыжор, оперны рэжысёр.

**1940** год — нарадзіўся Рынга Стар, англійскі музыкант, ударнік гурта «Бітлз», член Залы славы рок-н-рола ў яе складзе.

**1990** год — у Рыме ўпершыню выступілі разам тры выдатныя тэнары сучаснасці — Лучана Паварoці, Пласіда Дамінга і Хасэ Карэрас. Канцэрт быў дабрачынный акцыяй, а яго запіс разышоўся рэкордным тыражом у гісторыі класічнай музыкі. Тэнары выступілі на сцэне ў тэрмах Каракалы ў Рыме. У канцэрце бралі ўдзел адразу два аркестры: Флярэнцыйскі і аркестр Рымскага опернага тэатра. Усяго «Тры тэнары» за 11 гадоў далі 35 канцэртаў. Праект меў велізарны камерцыйны поспех.

Так гаварылі...

**ЛАРАШФУКО:**

*«Старыя таму так любяць даваць добрыя парады, што ўжо не здольны паказваць дрэнныя прыклады».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Як называецца бландзінка, якая перафарбавалася ў брунетку?**
**— Штучны інтэлект.**

— Дарагі, мне здаецца, у карбюратар вада трапіла...
— Ой, якія мы разумныя сталі... у машынах разбіраемся. Ты хоць ведаеш, дзе карбюратар знаходзіцца?
— У машыне...
— А машына дзе?
— У рацэ...

**Запіска мужу:**
**Саша, забяры свайго сына з дзіцячага садка!**
**P.S. Ён сам цябе пазнае!**

Хітрыя і каварныя лекары пытаюцца, дзе баліць, а потым цісныць менавіта туды.

**Дзве бландзінкі каля машыны:**
**— Ой, кола спусціла!**
**— Зусім?**
**— Не, толькі знізу.**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.
прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2232.
Нумар падпісаны ў 19.30 6 ліпеня 2020 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12